ліз драм. твора), «у выгарадках» (у рэпетыцыйным памяшканні без дэкарацый, толькі з мінімальнымі яе элементамі), на сцэне (спачатку ў частковым, потым у поўным маст. афармленні), манціровачныя (канчаткова вызначаецца дэкарацыйнае, светлавое, гукавое, шумавое, муз. афармленне спектакля), прагонныя (у час якіх акты і дзеі спектакля зводзяцца ў адзінае цэлае) і генеральныя (адбываюцца перад выпускам спектакля ў прысутнасці гледача). У муз. тэатры практыкуюцца Р. аркестравыя, канцэртмайстарскія (сольныя і ансамблевыя), харавыя, харэаграфічныя і інш. Рэпетыцыйны метад падрыхтоўкі выкарыстоўваецца таксама і ў працэсе падрыхтоўкі эстрадных канцэртаў, цыркавых праграм, масавых мерапрыемстваў, дзярж. святкаванняў і г.д.

*І.А.Алексніна.*

**РЭ́ПЛІКА** (франц. réplique, італьян. replica ад лац. replico паўтараю, адказваю), элемент сцэнічнага дыялога, фраза, якую акцёр гаворыць у адказ на словы партнёра, а таксама апошняя фраза, за якой ідзе тэкст іншай дзеючай асобы. Яна мае сэнс толькі ў сувязі папярэдніх і наступных Р. Мінімальнае адзінства сэнсу і становішча ўтвараецца парамі: рэпліка — контррэпліка, слова — контрслова, дзеянне — рэакцыя.

*І.А.Алексніна.*

**РЭСПУБЛІКА́НСКІ ТЭА́ТР БЕЛАРУ́СКАЙ ДРАМАТУРГІ́І.** Створаны ў снеж. 1990 у Мінску як структурнае падраздзяленне Бел. т-ра імя Я.Купалы па рабоце з драматургамі. З 1993 атрымаў статус рэсп. тэатра і сучасную назву. Заснавальнік і першы маст. кіраўнік тэатра В.Мазынскі. З вер. 2000 тэатр узначальвае В.Анісенка. Гал. мастак В.Цімафееў (да 2000). З вер. 1994 працуе з пастаянннай трупай, сфарміраванай з выпускнікоў акцёрскага аддзялення Бел. АМ (маст. кіраўнік курса Мазынскі). Спектаклі ідуць на бел. мове. Першы спектакль — «Ку-ку» М.Арахоўскага (1.2.1992). Т-р аддае перавагу творам пачынаючых драматургаў, у рабоце з якімі выкарыстоўваюцца індывідуальныя формы працы, штогод праводзяцца семінары, сцэн. чытанні п'ес па ролях і інш. Найб. ўвагу аддае фарміраванню бел. рэпертуару: «Барбара Радзівіл» Р.Баравіковай, «Галава» І.Сідарука, «Віта брэвіс, альбо Нагавіцы святаго Георгія» і «Чорны квадрат» М.Клімковіча і М.Адамчыка, «Павалійўся нехта» паводле У.Галубка і Л.Родзевіча, «Містэр Розыгрыш» С.Кандрашова, «Пеўчыя» Г.Марчука, «Заложніца кахання» і «Стомлены д'ябал» С.Кавалёва, «Дзіця з Батлеема»





***Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі.*** *Сцэны са спектакляў «Апошняя пастараль» паводле А.Адамовіча (уверсе) і «Бот і яго шкарпэтка» Г.Ахтэрнбуша.*

М.Пінігіна, «Апошняя пастараль» М.Дзінава паводле А.Адамовіча, «Развітанне з Радзімай» А.Паповай, «Жанчыны Бергмана»